Беларусь.info

№13 18/03/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**На Кастрычніцкай плошчы прайшоў шматтысячны мітынг.** Каля паловы на дзясятую на Кастрычніцкай плошчы пачаўся мітынг. Сяргей Калякін паведаміў, што ў іх затрымалі гукаўзмацняльную апаратуру, таму напачатку Мілінкевіч быў вымушаны выступаць з мэгафонам. Каля 10-й гадзіны была ўсталёўваная гукаапаратура і пачаўся мітынг. На плошчы таксама зьявіўся Аляксандар Казулін. Па розных ацэнках колькасьць удзельнікаў ад 30 да 50 тысяч чалавек. Беларусы ськінулі страх і сьмела выйшлі на плошчу, не спалохаўшыся ні АМАПу за сьпіны якога схаваўся Лукашэнка, ні снайпераў на дахах будынкаў. А. Міленкевіч не праызнае вынікаў ЦВК і патрабуе другі тур. Над людскімі галовамі лунаюць сьцягі і вокліч “Жыве Беларусь!”. Мінаючыя аўтамабілі сігналяць, а кіроўцы паказваюць ў вокны два пальцы ў гору — знак перамогі. Па заканчэньні мітынга шматтысячная калона прайшла на пл. Перамогі і ўсклала кветкі да помніка.
Некаторыя людзі застаюцца на месцы і намераныя чакаць заўтрашняга мітынгу.

**На ўчастку №40 г Мінска па вуліцы Бяды 11 к 1 былі складзеныя наступныя пратаколы:**
**1394 усяго галасавала**
**1161 за Лукашэнку**
**64 за Мілінкевіча**
**52 за Казуліна**
**96 за Гайдукевіча**
Сябры выбарчай камісіі сцвярджаюць, што галасы не лічыліся, нават не раскладаліся па стосіках.
Некаторыя сябры камісіі, а таксама назіральнікі ад АБСЕ і ад БНФ адмовіліся падпісаць пратакол.
Юрыдычна павінен быць пералік галасоў.

# Цытаты

**Аляксандр Мілінкевіч: Сёння паўстала Новая Беларусь.**
- Я хачу адкрыта заявіць, што нягледзячы на ўсё, у нашай краіне, ніколі так актыўна не расла прага да годнага грамадзянскага жыцця і прага да жыцця ў свабоднай дэмакратычнай Беларусі. Сёння паўстала Новая Беларусь. Новы, моцны грамадска-палітычны рух За Свабоду, Праўду, Справядлівасць, які змяце з мапы Еўропы яе апошнюю дыктатуру. Ён створаны разумна, спакойна і дастойна. Створаны самымі мужнымі сынамі і дочкамі нашага народа.
- Мы здабудзем свабоду. Наша барацьба святая. З намі вера, з намі праўда, з намі Божая Маці! Свабода пераможа. Беларусь пераможа! Жыве Беларусь!

# Абвесткі

**20 сакавіка ў 18:30 новы мітынг на Кастрычніцкай плошчы ў Менску.** Не аддамо нашай Перамогі!